УДК 726.01 (476)

# Функцыянальныя схемы сучасных праваслаўных храмаў Беларусі

Арабей В.Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Функцыянальныя схемы сучасных праваслаўных цэркваў Беларусі захоўваюць традыцыі хрысціянскага дойлідства і прадстаўлены 7 групамі памяшканняў паводле іх функцыянальнай прыналежнасці:

***Богаслужбовая*** функцыя адыгрывае ключавую ролю ў структуры царквы, з'яўляецца духоўным і кампазіцыйным ядром кожнага храма. Яна заўсёды прадстаўлена такімі планіровачна вылучанымі зонамі, як алтар, салея і малітоўная зала, часта дапаўняецца трапезнай, бабінцам, хорамі, званіцай, часам – хрысцільняй, залай для адпявання.

***Службова-бытавая*** функцыя з'яўляецца другой па значнасці пасля богаслужбовай і цесна ўзаемадзейнічае з ёй. Дзякуючы памяшканням названага прызначэння, магчыма фарміраванне адмысловых рыс архітэктуры праваслаўнага храма і стварэнне максімальна спрыяльных умоў для адпраўлення набажэнстваў і служэння кліру.

***Асветніцкая функцыя*** ў параўнанні з богаслужбовай і службова-бытавой адлюстроўвае спецыфіку місіянерскага служэння канкрэтнага прыходу і можа быць прадстаўлена нядзельнай школай, бібліятэкай, залай для лекцый.

***Дабрачынная функцыя*** праваслаўных прыходаў раскрывае яшчэ адзін напрамак служэння царквы – сацыяльны. Прадстаўлена, як правіла, трыма асноўнымі тыпамі памяшканняў: для брацтваў і сястрыцтваў, пакоямі раздачы дапамогі і трапезнай для немаёмных.

***Гандлёвая функцыя*** абавязкова прысутнічае ў кожным праваслаўным храме, што тлумачыцца непарыўнай сувяззю з працэсам набажэнства. Яна можа быць прадстаўлена невялікім прылаўкам непасрэдна ў малітоўнай зале, вылучацца ў самастойнае памяшканне ва ўваходнай зоне храма (свячны кіёск) альбо мець асобны будынак.

***Гаспадарчая функцыя*** закранае розныя бакі дзейнасці прыходу і храма, але мае ўстойлівую тэндэнцыю павелічэння з ростам лінейных памераў царквы. Можа быць прадстаўлена ў малых храмах зонай для прыбіральнага інвентара, а ў вялікіх – значнай колькасцю памяшканняў з гаспадарчай, дапаможнай і вытворчай спецыфікай.

***Інжынерна-тэхнічныя*** памяшканні пачалі актыўна ўдзельнічаць у фарміраванні функцыянальна-планіровачнай структуры і кампазіцыі храмаў з XX ст. Дамінуючая задача – забеспячэнне камфортных умоў выкарыстоўвання памяшканняў і ўвядзенне ў структуру храма разнастайных функцый з спецыфічнымі патрабаваннямі па эксплуатацыі.